

# ІВАНОВІЧ Іван Іванавіч

Нарадзіўся ў 1935 годзе ў в.Падбалоцце Зэльвенскага раёна.

Працоўны шлях пачаў 15-гадовым падлеткам пасля заканчэння Падбалоцкай пачатковай школы. Працаваў на сельскай гаспадарцы.

З 1951 года працаўладкаваўся на свінагадоўчую ферму в.Падбалоцце. За час працы зарэкамендаваў сябе вопытным жывёлаводам. Прысвоена званне “Ударнік камуністычнай працы”. У 1978 годзе з’яўляўся ўдзельнікам ВДНГ.

Неаднаразова выходзіў пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве сярод жывёлаводаў калгаса і ўзнагароджваўся знакам “Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва”.

Пастановай праўлення калгаса “Прагрэс”, партыйнага камітэта і прафкама калгаса ад 27.02.1982 г. за вялікія заслугі ў развіцці калгаснай вытворчасці Івановіч І.І. занесены ў кнігу Працоўнай Славы гаспадаркі.